**Тухта, В.** Па горным серпанціне / В. Тухта // Лепельскі край. — 2014. — 11 сак. — С. 5.

## ПА ГОРНЫМ СЕРПАНЦІНЕ



У кастрычніку 1986 года ўраджэнец вёскі Вілы Васіль Вашкевіч трапіў у Афганістан. Службу праходзіў у 350-м палку 103-й Віцебскай паветрана-дэсантнай дывізіі. За паўтара года службы па пыльных афганскіх дарогах накатаў на КамАЗе тысячы кіламетраў, перавозячы ваенныя грузы. Асноўная транспартная магістраль праходзіла праз перавал Саланг. Яго называлі дарогай жыцця і смерці. Дарога вузкай змейкай серпантынам то ўзнімалася ўверх, то спускалася ўніз, што патрабавала ад вадзіделя быць даволі пільным. Транспартныя калоны былі добрай мішэнню для «душманаў», якія часта падпільноўвалі на пазіцыйна зручных вяршынях. Падчас аднаго з нападаў «душманаў» ад калоны з трыццаці аўтамашын засталося ўсяго некалькі адзінак. Пашчасціла вывесці з-пад варожага абстрэлу КамАЗ і Васілю.

Вось так, на мяжы жыцця і смерці, прайшло паўтара года службы. Дадому хлопец вярнуўся з медалямі «За баявыя заслугі» і «За адзнаку ў воінскай службе» другой ступені.

Пра свае армейскія будні Васіль Вашкевіч сціпла распавядаў вучням Слабадской сярэдняй школы падчас сустрэчы. Дзецям было цікава паслухаць аповеды аб той далёкай і малавядомай вайне свайго земляка.

**Валерый Тухта**

**На здымку:** *Васіль Вашкевіч з вучнямі Слабадской сярэдні школы*

**Фота аўтара**